5. Минская областная библиотека имени А. С. Пушкина [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://pushlib.org.by/node/379. – Дата доступа: 17.07.2019.

6. *Михайлова, В.* Эколого-просветительский проект «Дети Бреста – за раздельный сбор отходов!» / В. Михайлова // Бібліятэчны свет. – 2019. – № 4. – С. 7–9.

7. Учреждение культуры «Могилевская областная библиотека им. В. И. Ленина» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://library.mogilev.by/. – Дата доступа: 17.07.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЭСТАФЕТА ЗМАГАННЯ І ПЕРААДОЛЕННЯ (КАГНІТАЛАГІЧНЫ ПОШУК У ФІЛАСОФСКАЙ І МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ ПАКАЛЕННЯ 1940-х гг.)

***А. У. Рагуля,***
*кандыдат філалагічных навук, прафесар культуралогіі кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Рубрыка «Эстафета змагання і перамог» была дамінуючым топасам у культуры Усходняй Еўропы на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў пасля Другой сусветнай вайны. Яна ў асноўным задавальняла нарматыўныя патрабаванні партыйна-савецкай афіцыйнай ідэалогіі – устаноўку на паказ трыумфальнага руху ад перамогі да перамогі на шляху да светлай камуністычнай будучыні.

Беларусь была ў эпіцэнтры ваенных дзеянняў у сусветных войнах XX ст. У нацыянальнай культуры настойліва ўвесь час набірала сілу альтэрнатыўная афіцыйнай ідэалогіі традыцыйная канцэпцыя быцця. На фоне трагедыі выбітых у войнах пакаленняў нацыянальная культура праўдзіва адлюстравала трагічны лёс абпаленага вайной маленства. Семантыка топасу «трэцяе пакаленне» ў творчасці М. Гарэцкага, М. Лынькова, К. Чорнага, В. Быкава, М. Савіцкага звернута

да грамадзянскага сумлення былых і новых пакаленняў, у тым ліку і тых, якія сёння вызначаюць кірункі духоўнага і сацыяльнага руху нацыі ў заўтрашні дзень. Менавіта на гэтым напрамку сёння найбольш поўна раскрываецца агульнаеўрапейская значымасць беларускай духоўнай культуры – філасофскія сэнсы традыцыйнай стылістыкі і паэтыкі. Экспрэсія сюжэтабудовы ў інсіце (творчасць Я. Драздовіча, А. Кіш і інш.) з'яўляецца адказам на выклікі глабалізаванай імперскай ідэалогіі татальнага ліквідатарства ў сферы духоўнай культуры. Такая ўстаноўка ў беларускім этнічным архетыпе забяспечана працай нацыянальнага духу і народнага інтэлекту. Пачуццём вернасці гуртавому інстынкту продкаў і грамадзянскай адказнасці кіраваліся А. Адамовіч, Я. Брыль і У. Калеснік, якія ў кнізе «Я з вогненнай вёскі» (1975) апублікавалі ўспаміны ахвяраў фашысцкага тэрору:

«Толькі ў маёй братавай – а брата там забілі, на поплаве, – было дзіцёначка малое на грудзях прывязанае, дык тое толькі "кува! кува!" закрычала…

Усё. Кончылася.

Прыносяць салому сюды, у гэтую зямлянку. <…> Салому – шарах сюды і запаліў» [1, с. 24].

Палітыка этнацыду не здолела вытруціць у нацыянальнай свядомасці дух віталізму, зламаць волю да жыцця, скіраваць нацыянальны культурны працэс на эстэтызацыю некрафільства і чалавечай адсутнасці ў свеце.

З'яўленне беларускай аўтарскай творчасці ў культурнай прасторы Цэнтральнай Еўропы ў XIX–XX стст. стала новым этапам у развіцці традыцый, вытокі якіх пачынаюцца ў глыбінных пластах агульначалавечага культурагенезу. Індыйскі даследчык і перакладчык В. Сінгх, які ў 1987 г. наведаў Беларусь, у нататцы «Вясёлка сяброўства» звярнуў увагу на «абсалютна новую, бязлітасную праўду пра вайну» ў творах В. Быкава: «Праўду, у якой жахлівыя факты спалучаліся з духоўнай філасофіяй. Я прачытаў аповесці Васіля Быкава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Сотнікаў” і “Абеліск”. Адначасова гэта было і адкрыццё беларускай літаратуры, яе мастацкай магутнасці – крыніцы ўсечалавечай духоўнасці. Гэта літаратура аказалася неад’емнай часткай мастацкага свету, што стагоддзямі ствараўся пісьменнікамі-гуманістамі: Вальмікам, Калідасам, Дантэ, Шэкспірам, Львом Талстым і многімі іншымі. Гэты свет у свядомасці індыйцаў знаходзіць аналогію з легендарным полем бітвы Курукшэтра, апісаным у старажытным індыйскім эпасе “Махабхарата”, полем бітвы дабра і зла» [4, с. 165].

На этапе паміж дзвюма сусветнымі войнамі еўрапейская думка перасцерагала грамадства аб вялікай пагрозе дэтэрытарызаванай і дэперсаналізаванай масавай свядомасці, сфабрыкаванай ідэолагамі таталітарызму, якія ў рабоце М. Хайдэгера «Быццё і час» (1927) названы “іншымі”. Яны, як і іх наймальнікі, зацікаўлены ў дасканаленні тэхналогіі сацыяльнай мімікрыі: «У выкарыстанні публічных транспартных сродкаў, у прымяненні публічнай інфармацыйнай сістэмы (газета) усялякі іншы падобен іншаму. Гэтае быццё-з-іншым поўнасцю растварае сваю прысутнасць кожны раз у спосабе быцця “іншых”, а менавіта так, што іншыя ў іх адрозненасці і выразнасці яшчэ больш знікаюць» [5, с. 126].

Застаецца ўсярэдненая безаблічная і безадказная абстракцыя «людзі». Тэхналогія расчалавечвання індывідуума ператварае асобу ў дэталь для мегамашыны татальнага ліквідатарства людскасці. Складваецца сітуацыя, у якой пытанне «хто?» не мае сэнсу: «Хто тут невядомага роду, людзі» [5, с. 126]. Людзі, такім чынам, у таталітарным соцыуме ператвараюцца ў «іншых». У М. Хайдэгера катэгорыя «іншыя» – гэта двайнікі: іх прысутнасць у чалавечым быцці абумоўлена захаваннем формулы «як людзі, як усе», але без чалавечай самасці, без клопату пра чалавечае ўзаемаразуменне – без чалавечай сутнасці, без думкі пра адказнасць за чалавечае жыццё, канкрэтную і агульную чалавечую сітуа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыю. У беларускай народнай культуры катэгорыя «іншыя» пазначана лексемамі «ваўкалакі», «русалкі», «вобаратні», «пярэваратні», «віды». Сярод іх вылучаюцца ахвяры, якія памагаюць сваім катам і безаглядна помсцяць перш за ўсё жывым «задумным і цікаўным», якія імкнуцца пераадолець на Зямлі ўладу цёмных сіл. У народнай культуры вынікі інвалюцыі «выхадцаў» за межы чалавечай сітуацыі адлюстраваны ў выразных аксіялагічных характарыстыках катэгорый «нелюдзі» і «вылюдкі». З улікам гэтага канфлікту ўнутры этнічнай супольнасці Янка Купала ў сваіх паэтычных медытацыях звяртаўся да паглыбленага пераасэнсавання фундаментальных універсаліяў: абсалютнага духу і абсалютнай ідэі. Характэрнай у гэтых адносінах з'явай з'яўляюцца санеты аўтара, напісаныя ў 1913 – 1915 гг. Іх можна аб'яднаць рубрыкай запыту «чаму?», які стаў загалоўкам аднаго з твораў паэта:

Няма для духа вольнага граніцы, меры,
Дзе б ён сягнуць не смеў, дзе б ён не узлунаў;
У хаосе быцця, у цьме ўсясветных з'яў
Ён не ніштожыцца, у сябе не губіць веры.

Яму да тайнаў душ і сэрц адкрыты дзверы,
Усё тое спазнае, што бег сталеццяў не спазнаў;
Як фенікс з попелаў, узносіцца з канаў,
На дно якіх яго спіхаюць цемраў зверы.

Магутны, векавечны, створан з сонц мільёнаў, –
Гром, перуны ў руках трымаць, спыняць не слаб,
Хоць бы ў агні кіпеў, ў віхрах марозаў зяб…

Аднак чаму ж ты там нішто, дух непрыгонны,
Дзе, дружна звонячы ў кайданы ўсімі тоны,
Крывёй, пажарамі частуе раба раб? [3, с. 19].

Звернуты да абсалютнага духу Купалаўскі запыт праз дзесяцігоддзі паўтарыўся ў працы М. Хайдэгера «Выслоўе



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Анаксімандра»: «Ці не стаім мы ў надвячорку найбольш жахлівай перамены ўсёй Зямлі і таго часу гістарычнай прасторы, у якой трымаецца гэтая Зямля? Ці не стаім мы ў вячэрнім пярэдадні нейкай ночы перад ранішнім ранкам? Ці не для таго мы выйшлі ў дарогу, каб імігрыраваць у краіну гэтага вечаровага канца Зямлі? Ці не ўзыходзіць яшчэ толькі гэта краіна канаючага Захаду?» [6, с. 31–32].

Адказ на пытанне пра месца чалавека ў касмічнай карціне быцця беларуская думка фарміруе на грунце асэнсаванага вопыту онтаснага мыслядзеяння народнай культуры, дасягненняў у галіне сучаснага матэматызаванага прыродазнаўства і кібернетыкі, тэорыі сістэм і сучаснай філасофскай і фенаменалагічнай эстэтыкі. На гэтым напрамку ў Беларусі фарміруецца базавы прынцып кагнітыўнага дзеяння – інтэнцыйнае канструяванне. У субардынацыйнай сувязі з ім знаходзяцца логіка-сэнсоўны і прычынна-функцыянальны метады. На гэтым напрамку адкрываецца магчымасць рэалізацыі патэнцыялу дыялектыкі супярэчлівага суб'ект-аб'ектнага адзінства ў творчым працэсе. М. Крукоўскі ў сваёй не апублікаванай на мове арыгінала працы пісаў пра дынаміку адносін суб'ектыўнага і аб'ектыўнага кампанентаў у структуры пазнавальна-эстэтычнага дзеяння: «Разглядаць аб'ект толькі як аб'ект, па-за ўсялякай сувяззю з суб'ектам, немагчыма як у агульнафіласофскім плане …, так і ў яго канкрэтна-эстэтычным выражэнні» [6, с. 446].

На сучасным этапе, пераканаўча даводзіць беларускі філосаф, існуе неабходнасць разглядаць эстэтычныя адносіны ўжо з боку суб'екта. Адзначым суб'екта не столькі ў выглядзе абстрактна ўзятай асобы, але і ў выглядзе нацыі – як супольнага суб'екта культуры. Вядомы нямецкі філосаф К. Хюбнер у працы «Нацыя: ад забыцця да адраджэння» (1991) адзначыў ролю рамантызму ў самаідэнтыфікацыі нацыі як самакаштоўнаснай дзейнай сілы ў гуманістычным прагрэсе: «Варта дабавіць, што мы глыбока абавязаны само-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

му рамантызму нават там, дзе ён пацярпеў паражэнне. Як гэта часта бывае, блытаныя сцежкі ў глыбіні адначасова вялі да багатых пазнавальных рэзультатаў. Яны высвецілі даўно ўжо схаваныя ад вачэй скарбы нацыянальнага мінулага ў народных кнігах, сагах, казках і старадаўніх эпасах, якія сталі не апошняй крыніцай лінгвістыкі, вельмі разгалінаванай сёння навукі. Пашыраная сёння схільнасць бараніцца ад усяго таго, што можа быць звязана з рамантызмам, ёсць пагэтаму не што іншае, як забабоны, заснаваныя на невуцтве і недаразвітым мысленні» [7, с. 144].

Вызваленая з-пад уціску вульгарна-матэрыялістычнага дагматызму тэорыя нацыі сёння адкрывае прастор для абнаўлення парадыгмы гуманітарнага даследавання.

Беларуская канцэпцыя суб’ектывацыі ў кагніталогіі складвалася ў ходзе пераадолення ліквідатарскай актыўнасці імперскіх сіл у «забраным краі». У XIX ст. этнакультурны генацыд энергічна ў 1830-х гг. пачынаў сенатар Навасільцаў. Эстафету ліквідатарства ў 1860-х гг. перахапіў Мураўёў-вешальнік. У гады сталінскіх рэпрэсій тэхналогія ліквідатарства прымянялася з яшчэ большым размахам. У час нацыскай акупацыі ў Беларусі загінула трэцяя частка насельніцтва. Расправа з удзельнікамі вызваленчых рухаў, ліквідацыя Полацкай езуіцкай акадэміі, Віленскага ўніверсітэта, уніяцкай беларускай канфесіі, адмена дзеяння Статута, рэкрутчына, дэнацыяналізаваная царква і школа павінны былі, паводле задумы каланізатараў, завяршыць ліквідацыю беларускага этнасу. Тым не менш у Беларусі ў XIX ст. сфарміравалася нацыянальная інтэлігенцыя, здольная годна прадоўжыць традыцыі нацыянальнага Рэнесансу і Асветніцтва. У графіцы і жывапісе ў XIX ст. была створана школа арыгінальнага псіхааналітычнага партрэта, у якім выразна прасочваецца дынаміка традыцый філасофскай медытацыі, што складваліся яшчэ ў жанры фаюмскага труннага партрэта ў Егіпце і развівалася ў эпоху Сярэднявечча пад уплывам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ісіхасцкай арыентацыі на германеўтыку. Псіхалагічныя партрэты К. Альхімовіча, М. Андрыёлі, А. Ромера, Н. Сілівановіча з'яўляюцца тыпалагічна блізкімі да партрэтаў гістарычных дзеячаў польскай і беларускай гісторыі, увасобленых у творчасці славутага Я. Матэйкі. Іх яднае ўнутраная патрэба спасцігнуць сінхронны сэнс быцця – у «нязмерных глыбінях нязмерныя высі» (У. Дубоўка).

Псіхалагізаваны вобраз быцця ў беларускай мастацкай культуры XIX і XX стст. з'яўляецца пераканаўчай альтэрнатывай «казённай трухляціне» і імітацыйнаму сімулякру ў квазіавангардызме. Беларускі вопыт пераканаўча сцвярджае рэальную магчымасць іншага, людскага тут – быцця на планеце, якая сёння знаходзіцца ў паласе шэрага прыцемку. Відзяж у эстэтыцы XIX ст. адыгрывае дамінуючую ролю. Сёння гэты вопыт выконвае функцыі аб'ектыўнай культуры (тэрмін І. Зіммэля) або аб'ектыўна наяўнага ідэалу (М. Крукоўскі). Дзейсны вопыт аб'ектыўнай культуры Янка Купала канцэнтруе ў традыцыйным вобразе Прарока, які ідзе «з навукай новаю к людзям». Аднак паэта больш задавальняе ўсё ж звычайны Сам-чалавек, які здолеў пераплавіць у пякельных пакутах сілу болю і цярпення ў энергію прасветленага дзеяння:

Маё цярпенне, мой крывавы боль –
Што значаць перад мукамі мільёнаў,
Дзе безнадзейны стогны родзяць стогны,
А слёзы грызуць вочы ўсім, як соль!

Хоць дух мой ўзносіцца пад неба столь, –
Як галавой аб мур, там б'е паклоны.
Але як мал мой гэты ўздых шалёны…
Мой крык перад малітвай свету – ноль!

І веру я, што я нішто ў быцці –
Іначай думаць не дае сумленне, –
Аднак чаму ж здаецца мне нязменне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што меж майму цярпенню не знайсці,
Што так вяліка мне яно ў жыцці,
Як міліёнаў разам ўсіх цярпенне! [3, с. 7].

У экспрэсіянізме Янкі Купалы ўжо выразна вырысоўваецца канцэпцыя сапраўднага лідара нацыі – чалавека вялікай душы. У псіхалагічна насычаных містэрыях Купалы-драматурга адлюстраваны заключны этап эстафеты канстытуявання чалавечай сітуацыі, пазначаны ў сусветнай культуры вобразамі Праметэя, Іова, Фаўста. У містэрыі «Сон на кургане» Янка Купала пераасэнсоўвае антрапалогію гэтых вобразаў-універсаліяў і стварае беларускі варыянт у эстафеце інтэрпрэтацыі чалавечага існавання ў Сусвеце. Праметэй-, Іоў- і Фаўст-сітуацыю на сённяшні дзень завяршае створаная Янкам Купалам Сам-сітуацыя – вынік дасканалення здольнасці выразнага бачання сутнасці быцця і сэнсу дзейнасці чалавека ў рэальным гістарычным часе.

У прыцемках аксіялагічна не прасветленай сучаснасці істотнае значэнне мае здольнасць суб’екта да ўспрымання сэнсаў гука-інтанацыйнай сімволікі. Беларуская слоўная культура пачатку ХХ ст. шмат увагі ўдзяліла выкрыццю пустазвонства, пустаслоўя і фальшу ў грамадскім побыце. Якуб Колас, Максім Багдановіч, Кузьма Чорны, Паўлюк Трус праблему чалавечай шчырасці і чуласці вырашалі з дапамогай інтанацыйна-рытмічнай экспрэсіі на ўзроўні анталагічнай яе значымасці. Не лішнім будзе заўважыць, што ў беларускім фальклоры скрыпка і жалейка сталі сімваламі душы народа. Топас «гусляр перад тыранам» стаў такім жа папулярным, як і «дзеўка перад панам» ці «Хрыстос перад Пілатам». Сэнс гэтай сітуацыі з афарыстычнай дакладнасцю выказаны ў аповесці Змітрок Бядулі «Салавей» вуснамі галоўнага персанажа: «Не хачу быць панскім салаўём!»

Сам-сітуацыя ў беларускай культуры адлюстроўвае рэальны патэнцыял чалавецтва, аб’яднанага ідэяй дасканалення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свайго жыцця на Зямлі. Аднак глабалізацыя жыццёвага працэсу пры ўсіх яе несумненных вартасцях суправаджаецца абясцэньваннем духоўных каштоўнасцей, назапашаных нацыянальнымі культурамі, пашырэннем крызісу на ўсе сферы чалавечай дзейнасці. У творах В. Быкава перманентная вайна трактуецца як спосаб існавання сучаснага чалавецтва. Пісьменнік зрывае маскі з абыякавых да ўсяго, акрамя асабістых выгодаў, «іншых» – чалавекападобных істот, якія патаемна прагнуць як мага большай улады перш за ўсё над задуменнымі і цікаўнымі шукальнікамі ісціны. У творах беларускага празаіка гэтая парода прыстасаванцаў паказана як квазісвой чалавек, вельмі небяспечны ў крытычнай сітуацыі выбару. У аповесці «Мёртвым не баліць» капітан з асобага аддзела Сахно гоніць на міннае поле ніжэйшых па званню, каб цаною іх жыцця забяспечыць сабе выйсце з акружэння. Палонны немец Энгель, якога Васілевіч уратаваў ад нематываванага расстрэлу, у новай сітуацыі спакойна, гледзячы ў вочы таму ж параненаму Васілевічу, выконвае загад на яго ліквідацыю.

Масавая свядомасць у творах В. Быкава трактуецца як пошасць, якая нясе ў сабе пагрозу трансфармацыі нацыі ў натоўп эгаістаў-адзіночак. Разам з тым пісьменнік па-мастацку пераканаўча паказвае трагічную эстафету руху беларускай нацыі насустрач сонечнай раніцы заўтрашняга дня.

1. *Адамовіч, А.* Я з вогненнай вёскі / А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Каляснік. – Мінск : Маст. літ., 1975. – 448 с.

2. *Круковский, Н. И.* Собрание сочинений : в 5 т. / Н. И. Круковский. – СПб. : Нестор – История, 2017. – Т. 5 (доп.). – 456 с.

3. *Купала, Я.* Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Мінск : Маст. літ., 1995–2003. – Т. 4. – 44 с.

4. *Сінгх, В.* Вясёлка сяброўства. Далягляды / В. Сінгх ; уклад. А. Гардзіцкі. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 271 с.

5. *Хайдеггер, М.* Бытие и время / М. Хайдеггер. – М. : Акад. проект, 2013. – 460 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. *Хайдеггер М.* Разговор на проселочной дороге / М. Хайдеггер. – М. : Высш. шк., 1991. – 192 с.

7. *Хюбнер, К.* Нация: от забвения к возрождению / К. Хюбнер. – М. : Канон, 2001. – 400 с.

# МУЗЫКА СОВРЕМЕННЫХ БЕЛОРУССКИХ КОМПОЗИТОРОВ КАК СРЕДСТВО ПРИВЛЕЧЕНИЯ СТУДЕНЧЕСКОЙ МОЛОДЕЖИ К ИЗУЧЕНИЮ НАЦИОНАЛЬНОЙ ИСТОРИИ И КУЛЬТУРЫ

***С. А. Руткевич,***
*кандидат искусствоведения, доцент,*
*доцент кафедры духовой музыки Белорусского государственного университета культуры и искусств*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

История развития белорусского музыкального искусства имеет глубокие корни, ее истоки уходят в далекое прошлое. На протяжении долгого времени закладывались основы профессиональной музыкальной культуры. Современное музыкальное искусство активно развивается в русле основных мировых тенденций. Функционируют различные музыкальные коллективы – оркестры, хоры, ансамбли, известно большое количество отечественных исполнителей-солистов высокого уровня. Современные белорусские композиторы создали значительный пласт произведений, отмеченный влиянием зарубежных авангардных новаций. Следует отметить, что в белорусском музыкальном искусстве освоение авангардных идей в связи со сложными историческими событиями и общественно-политическими условиями происходило со значительным отставанием. Кроме идеологических и социальных причин, как отмечает Р. Сергиенко, подобная ситуация в белорусской музыкальной культуре во многом была предопределена также «особенностью национальной психологии и национальным менталитетом – толерантностью, от-